УДК 385.81

# ТРАГЕДЫЯ І ПАМЯЦЬ:
# ХАЛАКОСТ (ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁН, ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ)

**Арлачоў А. В.**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле расказана аб сістэматычным пераследзе і знішчэнні яўрэяў на тэрыторыі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці акупацыйнымі ўладамі нацысцкай Германіі ў 1941–1944 гадах падчас Другой сусветнай вайны, у рамках палітыкі «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання».

**Ключавыя словы:** акупацыя, генацыд, Халакост, Беларусь.

**Annotation**. The article describes the systematic persecution and extermination of Jews in the Dyatlovsky district of the Grodno region by the occupying authorities of Nazi Germany in 1941-1944 during World War II, as part of the policy of «The Final Solution of the Jewish question».

**Keywords**: occupation, genocide, Holocaust, Belarus.

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, які быў накіраваны на насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася як выратаванне ад яўрэйскага бальшавізму.

Па ўказанні Гітлера фашысцкія верхаводы ўлетку 1941 года пачалі распрацоўваць план «канчатковага рашэння яўрэйскага пытання». Гэта «канчатковае рашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне

ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала 1/3 частку яўрэяў усяго свету [1, с. 67].

У 1941 годзе, у верасні, у Дзятлаве было створана гета, у якім змяшчалася да 4 500 чалавек яўрэйскага насельніцтва. Гета было абнесена калючым дротам. Зняволеныя ўтрымліваліся пад узмоцненай аховай, за калючым дротам у некалькі радоў, у бараках або на адкрытых пляцоўках. Ім забаранялася зносіны са знешнім светам. Ня дазвалялася перадача прадуктаў. За спробу атрымаць што-небудзь з ежы зняволеныя расстрэльваліся. Калі іх выводзілі за калючы дрот, то пад узмоцненай аховай, з нашытымі на грудзях і спіне жоўтымі зоркамі [2, с. 3].

У сьнежні 1941 і ў ліпені 1942 гады немцы ўчынілі пагром яўрэйскага насельніцтва. У ходзе пагрому яны расстралялі 3 500 чалавек. З іх устаноўлены прозвішчы і імёны 1 601 чалавека. Астатнія ў пайменных спісах расстраляных і закатаваных не фігуруюць.

У г. Дзятлава знаходзяцца дзве брацкія магілы, у якіх пахавана 5 800 яўрэяў, расстраляных фашыстамі летам 1942 года. Акрамя таго ў Дзятлаўскім раёне былі яшчэ Дварэцкае, Казлоўшчынскае і Наваельнянскае яўрэйскія гета [3, с. 186–189].

Удалося даведацца некаторыя факты аб асобных людзях. Напрыклад, доктар Ёскель Атлас. Не шукайце яго ні ў якім даведніку, гістарычнай літаратуры па партызанскаму руху: гэтага імя там няма.

Ёскель Атлас прыехаў з Варшавы пагасцяваць да родных у Казлоўшчыну напярэдадні вайны, летам 1941 года. Ён атрымаў доктарскую ступень у Францыі і Італіі, яму яшчэ не было і трыццаці гадоў. Але вось вайна. Яго бацькі і сястра загінулі ў Казлоўшчынскім гета 24 лістапада 1941 года.

Ёскель збег з гета, арганізаваў групу маладых людзей. Хаваўся ў лясах Ліпічанскай пушчы, дзе хутка сустрэў байцоў Чырвонай Арміі, якія таксама хаваліся там. Яны былі ўзброены, але многія пакалечаны ў баях. Доктар

Атлас заняўся іх лячэннем, аперыраваў, усіх паставіў на ногі і стаў камандзірам баявой групы. У маладога доктара заўсёды атрымлівалася так, як ён задумаў. Заўсёды яму шанцавала, быццам бы ўсё жыццё ён вывучаў ваенную тактыку. Атрад Атласа ўвайшоў у Ленінскую партызанскую брыгаду, якой кіраваў былы камандзір, танкіст Барыс Булат, які ўцёк з палону. Ён быў цяжка паранены, Атлас хацеў ампутаваць яму руку, але зрабіў аперацыю так, што Булат мог трымаць у руках аўтамат. Аб цуды доктара, які ваюе ішла слава па ўсім краі.

Ваенны талент гэтага чалавека быў бясспрэчны. У адным баі Ёскель Атлас быў смяротна паранены. Яго вынес з-пад куляў партызан Ілля Ліпшовіч, але выратаваць таленавітага доктара ўжо не мог ніхто [4, с. 2–3].

Ёсць у Беларусі страшныі «могілкі вёсак», адзіныя ва ўсім свеце – у Хатыні. 4 885 беларускіх вёсак былі знішчаны карнікамі, з іх цалкам з усімі жыхарамі – 627, з часткай насельніцтва – 4 258. Гэта тая рэальнасць, якую фашызм рыхтаваў цэлым краінам і кантынентам, але шырока разгарнуць паспеў толькі тут.

Свае Хатыні ёсць і на Дзятлаўшчыне. Усяго ў пераліку населеных пунктаў Дзятлаўскага раёна, поўнасцю або часткова знішчаных нямецка-фашысцкімі захопнікамі разам з жыхарамі, налічваюцца 23 вёскі. За час акупацыі Дзятлаўскага раёна нямецка-фашысцкія захопнікі замучылі і расстралялі 5 227 мірных грамадзян [5, с. 2–3].

Планы кіраўніцтва нацысцкай Германіі адносна беларускага народа: 75 % нашых жыхароў збіраліся перасяліць на Урал, у Заходнюю Сібір ці на Каўказ, а 25 % меркавалася адправіць у Германію для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы. Беларускія землі на працягу 30 гадоў павінны былі быць каланізаваныя і заселеныя немцамі.

Ажыццяўленне нацыстамі палітыкі генацыду беларускага народа пачалося з першых дзён вайны. Расправы над людзьмі былі жудаснымі і пераўзыходзілі па жорсткасці сярэднявечнае варварства. Гітлераўцы

нярэдка заганялі людзей у будынкі, зачынялі дзверы і падпальвалі. З 9 200 населеных пунктаў, разбураных і спаленых акупантамі ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, 628 былі знішчаны разам з жыхарамі, 4 667 – з часткай насельніцтва. Каля 380 тысяч мірных жыхароў было вывезена на прымусовыя работы ў Германію, з іх – больш за 24 тысячы дзяцей.

У гады акупацыі, якая доўжылася на нашай зямлі 1 101 дзень, на тэрыторыі Беларусі было больш за 200 лагераў смерці, з іх – 14 дзіцячых.

У лагерах смерці на тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі больш за 1 мільён 500 тысяч грамадзян, у тым ліку каля 80 тысяч дзяцей. Усяго Беларусь страціла каля трох мільёнаў жыхароў. Кожны трэці жыхар нашай рэспублікі паклаў сваё жыццё на алтар Перамогі.

## Літаратура

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі пад рэд. Сачынка, В. І. – Т. 2. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі», 1994. – 473 с.

2. Газета «Перамога» (Дзятлаўскі раён, Гродзенская вобласць). – 2008. – 16 студзеня. – №4. – С. 3.

3. Бараноўксі, П. М. «Памяць». Гісторыка-дакументальная хроніка Дзятлаўскага раёна. – Мінск : « Універсітэцкае », 1997. – 582 с.

4. Газета «Перамога» (Дзятлаўскі раён, Гродзенская вобласць). – 2008. – 26 лютага. – № 9. – С. 2–3.

5. Газета «Перамога» (Дзятлаўскі раён, Гродзенская вобласць). – 2006. – 13 снежня. – № 96. – С. 2–3.